# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 20 (542) | Субота, 4 чэрвеня 1983 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

*З агульнауніверсітэцкага партыйнага сходу*

## З УЛІКАМ ЗАЎВАГ І МАГЧЫМАСЦЕЙ

Як паведамлялася ў папярэднім нумары нашай газеты, 27 мая адбыўся адкрыты агульнауніверсітэцкі партыйны сход. Па дакладу сакратара парткома М. І. Старавойтава на ім абмеркаваны задачы, якія вынікаюць з пастановы бюро ГК КПБ ад 7 красавіка 1983 г. «Аб рабоце парткома і рэктарата Гомельскага дзяржаўнага універсітэта па падрыхтоўцы і выхаванню прафесарска-выкладчыцкіх кадраў, павышэнню іх грамадска-палітычнай актыўнасці ў святле патрабаванняў лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС».

У пачатку даклада М. І. Старавойтаў сказаў аб тых высокіх патрабаваннях, якія ставіць камуністычная партыя і Савецкі ўрад перад вышэйшай школай на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва. Першаступеннае значэнне ў гэтай сувязі надаецца кадрам. Таму ва універсітэце распрацаваны і зацверджаны адзіныя «Патрабаванні да прафесарска-выкладчыцкага саставу, вучэбна-дапаможнага персаналу, супрацоўнікаў навукова-даследчага сектара з вышэйшай адукацыяй». Характарызуючы прафесарска-выкладчыцкі састаў ГДУ, М. І. Старавойтаў зазначыў, што, на думку рэктарата і парткома, ён дастаткова высокі, дазваляе павышаць якасць вучэбна-выхаваўчага працэсу, нарошчваць тэмпы навукова-даследчых работ.

У цэлым правільная расстаноўка кадраў на важнейшых участках дазволіла калектыву ГДУ па шэрагу паказчыкаў выйсці на перадавыя пазіцыі не толькі ў рэспубліцы, але і ў краіне. У пачатку красавіка стала вядома, што ўсе факультэты, а таксама кафедры грамадскіх навук ГДУ будуць прадстаўлены па ўсіх васьмі раздзелах, вызначаных Мінвузам СССР, у тэматычнай выстаўцы, упершыню арганізаванай на ВДНГ СССР, — «Універсітэты — вядучыя вучэбна-метадычныя і навуковыя цэнтры краіны». Выстаўка будзе працаваць у кастрычніку—снежні 1983 г. Нашы пэўныя поспехі, гаварыў далей дакладчык, адзначаны і ў пастанове бюро ГК КПБ. Аднак мы не павінны задавальняцца дасягнутым. Нам трэба не проста ўскрываць свае недахопы, але і сумесна высвятляць прычыны іх узнікнення і неадкладна ўхіляць.

У дзелавой, прынцыповай і патрабавальнай абстаноўцы прайшлі ва універсітэце партыйныя сходы па абмеркаванню рашэнняў лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС і іх ажыццяўленню. Галоўная ўвага завастралася на тым, што трэба зрабіць для ўзняцця прэстыжу ГДУ. Было выказана нямала крытычных заўваг, якія абагулены парткомам, рэктаратам, грамадскімі арганізацыямі і знаходзяць ужо рэалізацыю ў практычнай дзейнасці.

У дакладзе знайшлі шырокае адлюстраванне тыя меры, якія прыменены ў адносінах да парушальнікаў партыйных норм жыцця і працоўнай дысцыпліны. Ніхто не павінен разлічваць на іх пасладленне. Наадварот, гэтыя меры будуць узмацняцца. Гэтага ад парткома і рэктарата універсітэта патрабуе пастанова бюро ГК КПБ.

Многія пытанні, звязаныя з павышэннем якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, эфектыўнасці навукова-даследчай работы, падрыхтоўкай кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый і інш., грунтоўна абмяркоўваліся на пашыраным Савеце універсітэта пры ўдзеле першага намесніка міністра Мінвуза БССР Ф. М. Капуцкага 18 мая 1983 г. У прынятай пастанове, з улікам рэкамендацый бюро ГК КПБ, указана, як трэба паляпшаць нашу працу ў гэтым напрамку.

У пастанове бюро ГК КПБ адзначана, што ў павышэнні адказнасці, развіцця ініцыятывы, творчасці выкладчыкаў нізкая роля арганізацыйна-партыйнай работы. М. І. Старавойтаў дэталёва спыніўся на гэтых прабелах, сказаў, што неабходна зрабіць, каб у будучым іх не дапускаць. Ён указаў на неабходнасць удасканальвання кантролю і праверкі выканання прымаемых пастаноў, рашэнняў і г. д.

Належную ўвагу дакладчык удзяліў далейшаму ўдасканальванню арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва як важнага сродку павышэння інтэнсіфікацыі працы на кожным рабочым месцы.

Ва універсітэце яшчэ марудна павышаецца эфектыўнасць выхаваўчай работы са студэнтамі ў групах і асабліва ў інтэрнатах. Па прадстаўленню камітэта ЛКСМБ і студэнцкага прафкома за амаральныя паводзіны, апалітычнасць і невыкананне патрабаванняў Статута ВЛКСМ загадам рэктара выключаны з універсітэта пяцікурснік фізічнага факультэта В. Міроненка. Ён выключаны і з радоў ВЛКСМ.

На сходзе прыводзіліся і іншыя прыклады, якія пацвердзілі яшчэ нізкі ўзровень выхаваўчай работы не толькі сярод студэнтаў, але і асобных выкладчыкаў і супрацоўнікаў.

Актывізацыя работы савета куратараў інтэрнатаў, меры, прымаемыя рэктаратам, парткомам, грамадскімі арганізацыямі, дэканатамі павінны даць больш станоўчыя вынікі ў павышэнні паспяховасці студэнтаў, захаванні правіл пражывання ў інтэрнатах.

Да пачатку новага навучальнага года будзе завершана перабудова работы пярвічнай арганізацыі таварыства «Веды» універсітэта. Дзякуючы падтрымцы райкома партыі, раённай і абласной арганізацый гэтага таварыства і пасля выдзялення стаўкі адказнага сакратара прадстаўляецца магчымасць рацыянальна, эфектыўна і якасна выкарыстоўваць лектарскія кадры ГДУ.

Каб калектыў ГДУ не страціў заваяваных пазіцый, сказаў у заключэнне М. І. Старавойтаў, аказваў актыўнае ўздзеянне на ўсе бакі эканамічнага, сацыяльнага і духоўнага жыцця, неабходна ўсямерная падтрымка нашым добрым пачынанням і дапамога ва ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Па абмяркоўваемаму пытанню на партыйным сходзе абмяняліся думкамі і выказалі свае меркаванні выступіўшыя ў спрэчках: **Т. П. Гараніна** — дацэнт кафедры філасофіі, рэктар народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання; **Л. Я. Палякоў** — сакратар партбюро матэматычнага факультэта; **Д. Г. Процкая** — дацэнт кафедры філасофіі, кіраўнік метадычнага семінара; **В. А. Балакін** — загадчык кафедры фізікі цвёрдага цела; **Я. А. Семянчук** — намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце; **П. А. Савінскі** — начальнік аддзела кадраў; **М. І. Твардоўскі** — загадчык НДС; **Н. І. Колтышава** — старшыня студэнцкага прафкома.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведнаая пастнова.

У рабоце партыйнага сходу прыняў удзел і выступіў загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ГК КПБ В. М. Некрашэвіч.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

*Справаздачы і выбары ў партарганізацыях*

## З КЛОПАТАМІ АБ «ЛЁСЕ» ФАКУЛЬТЭТА

**На геалагічным факультэце закончылася вясновая залікова-экзаменацыйная сесія. Большасць студэнтаў разам з выкладчыкамі раз'язджаюцца на вучэбную і вытворчую практыкі. Таму па традыцыі справаздачы і выбары ў партарганізацыях універсітэта пачаліся з гэтага факультэта.**

На сходзе са справаздачным дакладам выступіла сакратар партбюро **Ж. А. Герасімава**. Яна дэталёва прааналізавала вынікі работы камуністаў за год. Найбольш сур'ёзная ўвага была звернута на паляпшэнне вучэбнай, навуковай і выхаваўчай работы, кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй. І гэта заканамерна. Узровень паспяховасці на геалагічным факультэце на сённяшні дзень жадае быць значна вышэйшым. Кваліфікацыя выкладчыкаў геафака абавязвае больш плённа і эфектыўна весці навуковыя даследаванні.

У справаздачным дакладзе ўказвалася, што яшчэ не ўсе камуністы факультэта актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, асобныя з іх без належнага пачуцця адказнасці выконваюць даручэнні. Яшчэ не на ўсіх кафедрах створан мікраклімат творчай таварыскасці і ўзаемаразумення. Не можа не трывожыць і тое, што факультэт утрымлівае незайздросныя перадавыя пазіцыі па правапарушэннях, дапушчаных студэнтамі. Гэта сведчыць аб недастатковай выхаваўчай рабоце, праводзімай у акадэмічных групах і інтэрнаце.

У дакладзе прагучала занепакоенасць змяншэннем прыёму студэнтаў на першы курс. Каб у наступным яго павялічыць, неабходна больш мэтанакіравана вывучаць попыт на маладых спецыялістаў — геолагаў, і не дапускаць узнікнення праблем з размеркаваннем выпускнікоў.

«Лёс» факультэта ўсхваляваў многіх яго камуністаў. Вось чаму выступіўшыя ў абмеркаванні справаздачнага даклада дэкан факультэта **А. П. Пінчук**, загадчык кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі **М. А. Жураўель**, дацэнт **І. С. Лазараў** гаварылі аб умацаванні матэрыяльнай базы факультэта, стварэнні палігона для правядзення практык і аб многім іншым, што павінна павысіць жыццяздольнасць і прэстыж адзінага ў нашай рэспубліцы геалагічнага факультэта.

Аб далейшым удасканальванні партыйнай работы, паляпшэнні вучэбна-выхаваўчага працэсу, умацаванні працоўнай, вучэбнай і выканаўчай дысцыпліны гаварылі выступіўшыя на сходзе камуністы студэнт **Ю. Кіракоў**, выкладчык **Ю. П. Іваноў**, дацэнт кафедры філасофіі **Д. Г. Процкая**, **Т. П. Гараніна** і інш.

Работа партыйнага бюро на сходзе прызнана здавальняючай. Па заслуханаму і абмеркаванаму справаздачнаму дакладу прынята адпаведная пастанова.

Выбраны новы састаў партыйнага бюро. Яго сакратаром зноў абрана дацэнт кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі **Ж. А. Герасімава**.

У рабоце справаздачна-выбарнага партыйнага сходу геалагічнага факультэта прыняў удзел сакратар Цэнтральнага РК КПБ **В. І. Чэпелаў**, прарэктар па вучэбнай рабоце, член-карэспандэнт АН БССР, член парткома **Л. А. Шамяткоў**, які прыняў удзел у абмеркаванні справаздачнага даклада, намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце **Я. А. Семянчук**.

**Б. ПАЎЛОВІЧ.**

## ПРЫ ЎДЗЕЛЕ ПАРТЫЙНЫХ РАБОТНІКАЎ

Ва універсітэце завяршыліся справаздачна-выбарныя сходы ў партыйных групах. Яны праходзілі ў атмасферы дзелавітасці і патрабавальнасці. Галоўная ўвага звярталася на тое, што трэба зрабіць ,каб павысіць узровень выкладаемых дысцыплін, яшчэ больш актывізаваць навукова-даследчую работу, забяспечыць эфектыўнасць выхаваўчага працэсу і г. д.

На некалькіх справаздачна-выбарных сходах партгруп прысутнічалі і выступілі партыйныя работнікі гарадскога і раённага камітэтаў партыі. У прыватнасці, у рабоце справаздачна-выбарнага сходу кафедры беларускай мовы прыняла ўдзел сакратар ГК КПБ Н. Ф. Іванова, студэнцкай партгрупы эканамічнага факультэта — загадчык аддзела прапаганды і агітацыі гарадскога камітэта партыі В. М. Некрашэвіч, кафедры навуковага камунізму — лектар гэтага аддзела Я. М. Бабічаў.

На справаздачна-выбарных сходах названых партгруп заслуханы і абмеркаваны справаздачы партгрупоргаў Д. Д. Паўлаўца, Г. А. Крачкоўскага і А. П. Касьяненкі. Гэтыя таварышы выбраны партгрупоргамі на новы тэрмін.

(Наш кар.).

## НА ЗАВОЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ— УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

Даўно распаўсюджанай і апраўданай стала завочная форма навучання. Больш 40 працэнтаў студэнтаў набываюць вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці і ў нашым

абітурыенты на адно месца на гістарычнае аддзяленне і аддзяленне фізічнага выхавання. Крыху меншы конкурс сярод жадаючых набыць спецыяльнасць біёлага. Уступныя экза-

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат факультэта фізвыхавання, кафедра фізічнага выхавання горача віншуюць загадчыка гэтай кафедры МЯДЗВЕДЗЕВА Валерыя Анатольевіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне**

* * *

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, кафедра АМАЭІ горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ЖЫГАЛІНУ Наталлю Васільеўну з выпадку прысу-**

